Просьба дасылаць любую інфармацыю пра сустрэчы з еўрапейскай балотнай чарапахай на поўнач ад Брэсцкай і Гомельскай абласцей на адрас: Lukashevich2@tut.by. Вашы звесткі дапамогуць лепш зразумець сапраўдныя межы арэала гэтага ўразлівага віду ў Беларусі.

Загадочный вальдшнеп

Вальдшнеп — один из самых многочисленных видов наших куликов. И тем не менее отдельные стороны его жизни до сих пор представляют загадку для ученых.

ЭДУАРД МОНГИН, СЕРГЕЙ ЗУЕНОК

MIKELANE45 / DEPOSITPHOTOS

«Хорканье» и «циканье»

Обычному горожанину, нечасто выбирающемуся на природу, эта птица, как правило, не знакома. Оно и понятно: обитает вальдшнеп в лесах, зачастую заболоченных, активен в основном в сумеречное и темное время суток, да еще скрытен и осторожен. При таких пристрастиях он довольно редко попадается на глаза даже более близким к природе сельским жителям. Впрочем, если задаться целью увидеть этого загадочного кулика, то достаточно весной отъехать недалеко от города в любой, пусть даже скромный лесок — и уже на закате с большой долей вероятности можно будет наблюдать токовые полеты, или так называемую тягу вальдшнепа. Занимаем позицию на лесной опушке, дороге или просеке, ждем...

Апрельский лес, в принципе, не слишком богат на звуки. Днем время от времени слышны позывки мигрирующих зябликов (наиболее нетерпеливые из них — правда, еще без особого куража — могут исполнять и свои мажорные территориальные песни). С ближайшей опушки звенит нежный колокольчик овсянки. Где-то в валежнике трещит крапивник. А в наполненной талой водой придорожной канаве довольно урчат травяные лягушки... Ближе к сумеркам на сцене появляется классическое вечернее трио: зарянка, черный и певчий дрозды. Их очень разные и по строю, и по тональности песни удивительно дополняют друг друга, создавая неповторимую музыку весеннего леса. Изысканно, гармонично, ненавязчиво, без летнего шума и гама... Неожиданно в эту мелодию вплетаются, на первый взгляд, совсем уж не музыкальные звуки, особенно отчетливо слышные в долгих паузах между задумчивыми посвистами черно-

го дрозда. Так и есть — вальдшнеп. Первый пошел... Представление начинается!

Над зубчатой кромкой уже почти черного леса, резко контрастирующего с розоватым закатным небом, чуть подернутым полупрозрачными перистыми облачками, тянет (да, не летит, а именно тянет) кажущийся на фоне еще светлого неба однотонно темным птичий силуэт. Длинные, сужающиеся к концам крылья, практически сливающиеся в одно целое с коротким хвостом, частые взмахи, стремительный полет — всем этим тянущий вальдшнеп сильно смахивает на летучую мышь-переростка. Ну, разве что отсутствие фигур высшего пилотажа да длинный, направленный к земле клюв говорят в пользу того, что мы все же имеем дело с птицей. Буквально через пару секунд вальдшнеп скрывается за уступом леса. Однако покидать наблюдательный пост рано — через пару минут появится второй, за ним третий, четвертый... Здесь следует сделать оговорку: маршрут у токующего самца кольцевой, пролетает он его за вечер не раз, при этом он отнюдь не единственный, кто желает найти себе подругу на денек-другой, так что четвертый вполне может оказаться первым или вторым, ну и так далее. А есть еще и самки, которые тоже умеют летать... В общем, полная головоломка для учетчика!

Начинается шоу уже в конце марта — начале апреля, практически сразу после прилета

Иногда вальдшнепы совершают токовые полеты не по общепринятому «расписанию». Отдельные птицы могут летать не только на закате, но и в ночные часы. А летом даже в предрассветных сумерках в четыре утра.



вальдшнепов. В это время лес еще не переполнен звуками других птиц и голос вальдшнепа слышен особенно отчетливо. Его, как мы уже выяснили, не слишком музыкальные звуки можно разделить на два типа: «хорканье» — хриплый низкий звук «хорр», за которым следует более тихий и высокий посвист — «циканье».

В конце мая — начале июня, когда все гнездовые территории уже заняты, а у многих воробьиных птенцы первого выводка даже покинули гнезда, немногочисленные вальдшнепы, у которых в разгар весны личная жизнь почему-то не заладилась, все еще продолжают токовать, вылетая на «маршрут» перед закатом. Они видны и слышны до самых густых сумерек, а с наступлением полной темноты голос подают лишь редкие птицы. Возможно, дело в том, что самцы облетают свои участки в поисках самок, а в темноте заметить их сложнее (хотя вальдшнепы неплохо видят и ночью). Кроме того, на ночное время приходится и наибольшая активность земляных червей — основного корма вальдшнепа. Именно в этот час птицы кормятся, вылетая на опушки и окрестные луга в поисках любимой еды.

Ну а как быть уж совсем закоренелому горожанину, для которого выбраться на часок-другой на природу нет никакой возможности, а увидеть вальдшнепа вживую страсть как хочется? Отчаиваться не стоит. В пору осенней миграции вальдшнепы останавливаются для отдыха и кормежки в крупных населенных пунктах, используя для этого придорожные лесопосадки, парки и даже старые сады в частном секторе — главное, чтобы посадка была многоярусной. Разумеется, целенаправленный поиск вальдшнепа в таких местах малопродуктивен, но вот случайно наткнуться на лесного кулика, скажем, во время прогулки по старому парку вполне реально. Сидят они на земле, полагаясь на свою покровительственную окраску, что называется, до последнего и взлетают практически из-под самых ног.

Самки вальдшнепа обустраивают примитивные гнезда, представляющие собой углубление в земле с незначительным количеством выстилки, куда откладывают, как правило, четыре яйца. Весенняя охота представляет угрозу для самок в связи с ранним гнездованием вида. В Беларуси гнезда находили в первых числах апреля, а во Франции кладки были зафиксированы еще в феврале.

Зачем считать вальдшнепов?

Необычное поведение и ночная активность вальдшнепа сильно затрудняют его изучение. Неразбериха с многократными круговыми полетами нескольких птиц, из-за чего одни и те же особи попадают в учеты несколько раз, еще больше запутывает ситуацию, и результаты учетов, как правило, оказываются завышенными.

Здесь на помощь ученым приходят современные технологии. Радиомечение помогло установить, что самцы занимают участки площадью около одного квадратного километра. Для более точных подсчетов используются так



Незаметно подкрасться к вальдшнепу невозможно: птица невероятно внимательна и осторожна. Вальдшнеп способен видеть на 360 градусов вокруг себя, не поворачивая головы: его глаза сильно расставлены по сторонам и высоко посажены. Видит птица и то, что происходит выше нее.



Токовые полеты вальдшнепы совершают не для того, чтобы пометить территорию, а чтобы найти самку. Самцы полигинны, то есть спариваются с несколькими самками. Пара держится вместе только 3–4 дня. Затем самец возобновляет брачные полеты.



За один сезон самец во время тяги токует над территорией площадью в 300 га. Многие вальдшнепы возвращаются каждую весну на одну и ту же территорию.



По данным радиотелеметрии, отдельные особи в один вечер могут совершать токовые полеты на территориях, расположенных на расстоянии 3 км.



За один вечер самец редко токует дольше 20 минут. Токовые территории разных самцов перекрываются, но они не дерутся за участки.



Самки участвуют в размножении уже на следующий год, а вот молодые самцы обычно даже не токуют.



У токующих вальдшнепов существует иерархия: доминирующие самцы токуют дольше других. Наличие такой иерархии характерно для вида в целом и не зависит от плотности популяции.



Птенцы могут летать уже в возрасте 21 дня, однако мать обычно сопровождает их на протяжении еще 17–18 дней. Самцы не насиживают кладки и не водят птенцов. А самки могут даже переносить малышей в полете, прижимая лапками к телу.



Случалось, что вокруг насиживающих самок были замечены птенцы первого выводка, что свидетельствует о возможности двух выводков за сезон.

Вальдшнеп встречается в лесах всех типов, в том числе в нешироких лесополосах, расположенных вдоль полей и озер. Даже на юге Беларуси, среди сухих сосняков, растущих на песчаных почвах, орнитологам приходилось за несколько часов учитывать до 3–5 самцов.

ЭДУАРД МОНГИН

называемые сонограммы — графическое отображение голосов самцов вальдшнепа, записанных во время учетов на тяге. Последующий анализ графиков позволяет выявить различия между голосами разных особей и более точно определить количество птиц, учтенных из одной точки. Однако такая методика очень трудоемка и не решает всех проблем с определением плотности гнездования.

Почему же так важно знать точную численность вальдшнепа? Дело в том, что на местах зимовок в европейских странах этот вид является одним из излюбленных охотничьих объектов и отстреливается в значительных количествах. Поэтому необходимо наблюдать за изменением его численности и по возможности регулировать добычу птиц охотниками.

В Беларуси численность вальдшнепа на гнездовании достаточно высока, а гнездящиеся птицы равномерно распределены по всей территории. После многочисленных учетов вальдшнепов и анализа данных можно дать приблизительную оценку их численности в полмиллиона условных пар. Условных, потому что самцы не принимают участия в насиживании и не создают постоянных связей.



В странах Европы охотники ежегодно добывают до четырех миллионов вальдшнепов, в то время как общая численность их популяции оценивается в десять миллионов особей (хотя, по мнению многих экспертов, эта оценка является заниженной).

Международный проект

Сейчас АПБ участвует в международном проекте — Программе по исследованию вальдшнепа *(Scolopax rusticola)* на территории Беларуси. Это обширная совместная работа с французскими и российскими коллегами. Сбор данных по учетам вальдшнепа в период гнездования позволит контролировать общее состояние популяции и регулировать добычу этого вида в местах зимовок.

В современных научных изданиях гнездящуюся в Европе популяцию вальдшнепа определяют как стабильную, однако появились первые данные по изменению численности этого вида на зимовках во Франции. В результате анализа многолетних данных по кольцеванию и добыче вальдшнепов во время охоты было установлено снижение соотношения числа молодых особей и самок как среди окольцованных, так и среди добытых птиц. Сейчас предполагается, что успешность размножения вальдшнепа в местах гнездования падает и, возможно, ухудшились условия гнездования.

Для определения успешности размножения вальдшнепов также отлавливают в период осенней миграции. При отлове определяют возраст птиц и соотношение молодых и взрослых особей. Если собран большой материал из различных мест пролета во время осенней миграции, то этот показатель может служить основой для определения успеха размножения вида. Установить, изменяется ли численность вида, можно только с помощью значительного количества данных на разных территориях.

Смотри в оба!

Наслаждайтесь теплыми деньками и природой вокруг себя. Некоторые из этих видов увидеть совсем просто, поиск других потребует терпения. Дерзайте!



Птичка с грозным латинским названием *Troglodytes troglodytes* (troglodytes с древнегреческого означает «обитающий в пещере») — одна из самых мелких пернатых Беларуси. Практически полное отсутствие шеи и привычка вздергивать хвост кверху делают крапивника похожим на пушистый шарик. Между тем эта миниатюрная птица, масса которой не превышает 12 г, имеет выдающиеся певческие способности, которые демонстрирует даже зимой. Самцы полигамны и сами строят гнезда, причем по несколько штук сразу — для всех партнерш. Любят селиться в густых лесах и среди бурелома.

НИКОЛАЙ ВОРОБЕЙ



СЕРГЕЙ ЗУЕНОК

Вооружен и очень опасен — это про него. Охотник каемчатый *(Dolomedes fimbriatus)* получил такое название за продольные полосы по бокам тела. Паук живет на берегу водоемов. В ожидании добычи он «распластывается» на поверхности воды и, как только улавливает вибрации приближающейся жертвы, молниеносно атакует и убивает ее смертоносным укусом. Питается насекомыми, головастиками и даже мелкой рыбой. Добытую пищу паук тащит на берег, там разжижает и поглощает ее в течение нескольких часов.



СЕРГЕЙ ЗУЕНОК

Щитника линейчатого *(Graphosoma lineatum)*, которого иначе называют итальянским клопом, проще всего увидеть в огороде. «Итальянцы» предпочитают питаться соком зонтичных растений, но не брезгуют и другими — группки этих насекомых нередко сидят на смородиновых кустах. Разные стадии развития насекомого можно наблюдать на протяжении всего лета и части осени: перезимовавшие клопы откладывают яйца весной, личинки встречаются с июня по сентябрь, а первые молодые взрослые особи появляются в июле. Как все клопы, в случае опасности щитники выделяют секрет с неприятным запахом. Благодаря цепким ногам они легко удерживаются на листьях в вертикальном положении, и даже сильный ветер не может стряхнуть их с «насиженного» места.

Это хищная муха, желтоспинный толкунчик *(Empis stercorea)*. Представители семейства толкунчиков питаются мелкими крылатыми насекомыми: ловят их на лету, протыкают и высасывают внутренности с помощью длинного хоботка. Часто мы видим этих мух в утренние или вечерние часы, когда они «толкутся» в воздухе среди растений. Такими танцами самцы привлекают самок. Чтобы партнерша, будучи не в духе, не съела незадачливого кавалера, тот обычно отвлекает ее вкусным подарком.




АЛЛА ЭРДМАН



DEPOSITPHOTOS

Розово-лиловые цветки василька лугового *(Centaurea jacea)* наверняка видели все: его яркими пятнами с июня по октябрь «горят» лесные опушки, луга и обочины дорог. У лугового василька цветки двух типов. Роскошные краевые — бесполые, их задача — привлечь насекомых-опылителей. За размножение отвечают срединные цветки, которые внешне выглядят куда скромнее. Пыльца в них размещена в лепестках-трубочках и накрыта «крышкой» из загнутых зубцов. Когда на лепесток садится насекомое, зубцы размыкаются, а комочек пыльцы выталкивается под брюшко опылителя.

Одну из самых ранних весенних бабочек — малинницу *(Callophrys rubi)* — не спутаешь ни с какой другой благодаря зеленой окраске обратной стороны крыльев. Лицевую, шоколадно-коричневую, сторону можно увидеть только в полете: находясь в покое, малинница никогда не раскрывает крыльев. Куколки этой бабочки умеют издавать писк, который когда-то считался своеобразным механизмом защиты от муравьев и пчел. Однако исследования показали, что подавать такие сигналы могут куколки и других бабочек семейства голубянок. Таким образом они, наоборот, привлекают внимание муравьев, которые относят их в свои подземные гнезда. Муравьи поглощают сладкий секрет, выделяемый куколкой, а взамен она получает защиту от других насекомых, которые не осмеливаются посягать на жилище ее покровителей. Время лёта — с середины апреля по июль. Встретить можно на опушках, в парках и садах.



АЛЛА ЭРДМАН

Природные активности летом и осенью для всей семьи

Пришли на пруд или реку? Внимательно осмотрите растительность на берегу: вдруг к стеблю осоки или рогоза прицепился экзувий — шкурка, оставшаяся после линьки личинки стрекозы! Личинки живут в воде, а для превращения во взрослую особь выбираются на сушу и садятся на опору — стебель растения. Спина у личинки трескается, и из нее вылезает молодая стрекоза. В Беларуси их пока отмечено 65 видов.

Поздно вечером возьмите фонарик и попробуйте изучить подводный мир ближайшего ручья или пруда. Просветите водную гладь — лучом света вполне возможно «выхватить» в темноте, например, тритона. У нас в стране их два вида — обыкновенный и гребенчатый, которых можно встретить на всей территории, хотя гребенчатый — более редкий вид.



Обыкновенный тритон

DEPOSITPHOTOS

Сделайте на своем участке ловушки для хищных жуков-жужелиц. Проделайте несколько отверстий в донышке стаканчика из-под сметаны или йогурта. Вечером в сухую погоду вкопайте его в землю по самый верх на уровне земли. Утром проверьте, кто попался, и не забудьте отпустить потом всех гостей на волю.

Своим многообразием удивят ночные бабочки. Самый простой способ привлечь их — включить лампу на улице и повесить возле нее светлую ткань. Обязательное условие — тихая и безлунная ночь, желательно, чтобы небо было затянуто облаками. Совсем скоро на полотне соберется разномастная компания ночных мотыльков. Рассматривайте, фотографируйте и определяйте.



Березовый шелкопряд

СЕМЕН ЛЕВЫЙ


Блакітная крыніца — возера крынічнага паходжання
ІГАР РУДАКОЎСКІ

Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы?

Культ пакланення крыніцам трывала ўкараніўся на тутэйшай зямлі, і таму яны даўно сталі аб'ектам паломніцтва вернікаў розных канфесій і часткай дазволеных рэлігійных практык. Між тым, як высвятляецца, з навуковага пункту гледжання мы ведаем пра крыніцы няшмат. А хто ведае больш, той раіць абмежавацца вонкавымі воднымі працэдурамі, без ужывання крынічнай вады ўнутр.

ВОЛЬГА СЛІБОРСКАЯ

Колькі крыніц у Беларусі?



Гутарым з **Уладзімірам Байчоравым**, доктарам біялагічных навук, загадчыкам сектара маніторынгу і кадастру жывёльнага свету Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах.

На google maps ёсць карта крыніц Беларусі, якую з 2008 года складаюць валанцёры. І гэта не адзіны прыклад аматарскіх спроб стварыць крынічны каталог. А ці праводзіўся перапіс беларускіх крыніц афіцыйна?

Навуковай карты, якую можна было б параўнаць з валанцёрскімі, на жаль, пакуль няма. Па рэках і азёрах ёсць, а па крыніцах не. Але акурат цяпер ідзе інвентарызацыя беларускіх крыніц на дзяржаўным узроўні.

У пазамінулым годзе крыніцы ўключылі ў водны кадастр Беларусі — гэта афіцыйны спіс усіх вадацёкаў і вадаёмаў краіны. На сёння існуе пакуль вельмі ўсечаны кадастр Брэсцкай вобласці і больш поўны — Гомельскай, у якім фігуруюць ужо 120 крыніц.

А хто займаецца гэтай працай?

Кіруе працэсам Міністэрства прыроды, у межах якога дзейнічае Цэнтральны навукова-даследчы інстытут комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў. Гэта колішні Усесаюзны інстытут воднай гаспадаркі, які базіраваўся акурат у Мінску. Там працуюць добрыя спецыялісты, таму крыніцы трапілі ў надзейныя рукі.

Але іх справа — зафіксаваць каардынаты, у лепшым выпадку — гідрахімію, дэбіт (прадукцыйнасць), глыбіню рэчышча. А вось біялагічную разнастайнасць бадай ніхто ў Беларусі не вывучае, акрамя нашага цэнтра.

Таму некалькі акадэмічных устаноў: НПЦ па біярэсурсах, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры і Інстытут прыродакарыстання — аб’ядналіся ў межах аднаго праекта і імкнуцца комплексна даследаваць і гісторыю, і гідрахімію, і біялогію крыніц.

Натуральна, мы абменьваемся інфармацыяй, дзелімся знаходкамі, меркаваннямі. Усё гэта заносіцца ў навуковую базу дадзеных, на якую можна будзе абапірацца пасля яеператварэння з рабочага дакумента ў афіцыйны.

Вяснянкі, аўсянікі і ручайнікі

Пра якую «біялагічную разнастайнасць» у крыніцах можна казаць?

У крыніцах жывуць вельмі спецыфічныя арганізмы, якія любяць халодную ваду. У нас жа ў Беларусі як — улетку цёпла, узімку холадна. Большасць відаў улетку размнажаецца, а на зіму альбо ў спячку ўпадае, альбо наогул зімуе ў выглядзе нейкіх спор. А ў крыніцах круглы год вада 8 градусаў, у іх сустракаюцца віды, характэрныя для горных раёнаў Цэнтральнай Еўропы і Скандынавіі.

Таму з пункту гледжання біялагічнай разнастайнасці крынічны макразаабэнтас (МЗБ) — вельмі каштоўны аб’ект для вывучэння. «Макра» — таму што гэтыя арганізмы параўнаўча вялікія (хаця насамрэч да 5 мм), «заа» — таму што гэта жывёлы, а не расліны, а «бэнтас» — бо жывуць на дне.

Непасрэдна ў месцы выхаду крыніцы на паверхню іх даволі мала. Калі ў рэках Беларусі можна знайсці 100, 200 відаў МЗБ, дык у крыніцах — 2, 3, 10... Мы лічым крынічнымі і тыя арганізмы, што жывуць крыху ніжэй па плыні, дзе крыніцы ператвараюцца ў маленькія ручаінкі.

У Беларусі тры самыя вялікія групы насякомых, чые лічынкі жывуць у крыніцах і з’яўляюцца паказчыкам чысціні вады. Гэта вяснянкі, аўсянікі (рус. поденки) і ручайнікі. Калі вы цікавіліся нажыўкай для рыбалкі, дык дакладна чулі пра шыцікаў. Гэта і ёсць лічынкі ручайніка, ледзь не самыя распаўсюджаныя насельнікі нашых крыніц. Яны яшчэ «домікам» такім «абрастаюць» з каменьчыкаў, палачак.

З суставаногіх вельмі цікавы тутэйшы від — рачкі-бакаплавы, што захаваліся з ледавіковых часоў менавіта дзякуючы крыніцам.

Значыць, ужываючы крынічную ваду, мы можам заглынуць цэлы набор мікраарганізмаў?

Ну, хто любіць біфштэкс, хто — эскалоп... Некаторыя народы штодня ядуць розных беспазваночных.

Я не ведаю атрутных крынічных жывёл, і непасрэднай небяспекі для чалавека яны не нясуць.



Лімнакрэн ЮРЫ ГІГІНЯК

А вось хімічны склад вады бывае надзвычай шкодны.

Людзі думаюць, што крыніца — гэта ледзь не святая вада. І калі святар прыйшоў і памахаў кадзілам, дык крыніцу асвяцілі, можна піць. Не, у лепшым выпадку яе проста асвятлілі. На жаль, у большасці выпадкаў ніхто гідрахімію гэтай вады не вывучае, ужо не кажучы пра бактэрыялагічны аналіз.

А між тым ёсць крыніцы, у якіх канцэнтрацыя некаторых рэчываў, напрыклад жалеза, істотна перавышае гранічна дапушчальныя паказчыкі. Ёсць крыніцы з завышаным утрыманнем кадмію, іншых цяжкіх металаў, якія могуць уплываць на рэпрадуктыўную сістэму чалавека.

Адным словам, з пункту гледжання бальнеалогіі беларускія крыніцы яшчэ вывучаць і вывучаць. І казаць пра гаючыя якасці вады ў беларускіх крыніцах заўчасна.

Лепшае — вораг добрага

Якога ўзросту «сярэднестатыстычная» тутэйшая крыніца?

А ніхто дакладна не ведае. Гісторыя беларускіх крыніц вывучана вельмі слаба. Ну вось стаіць храм XVI–XVII стагоддзяў, людзі ведаюць, што крыніца каля яго б'е ўжо гадоў трыста. Часта веды гэтым і абмяжоўваюцца.



Абагачаны жалезам гелакрэн Юры Гігіняк



Крэнаполе — некалькі гелакрэнаў, размешчаных блізка адзін да аднаго Юры Гігіняк

У Беларусі тры тыпы рэдкіх біятопаў, звязаных з крыніцамі

1. Крыніцы і крынічныя балоты

Крыніцы сустракаюцца па ўсёй Беларусі, але найбольш іх у паўночнай і цэнтральнай частках краіны.

Паводле напрамку руху падземных водаў да выхаду на паверхню крыніцы дадзенага тыпу падзяляюцца на сыходныя і ўзыходныя. Пераважная большасць крыніц у Беларусі — сыходныя.

Падземныя воды сыходных крыніц могуць прабіцца на паверхню ў выглядзе ручая на стромкім схіле — у гэтым выпадку яны сцякаюць, размываючы сустрэчныя пароды і ўтвараючы рэчышча. Такая крыніца называецца рэакрэн. Калі пры выхадзе водаў узнікае вадаём ці невялікі рэзервуар, крыніца называецца лімнакрэн. Перапаўняючы гэткі рэзервуар, вада выліваецца цераз беражкі, утвараючы ручай. Шматлікія выхады без канкрэтнага рэчышча і рэзервуару, калі воды высочваюцца на параўнальна роўную паверхню і фарміруюць гразкае балота, называюцца гелакрэн. У нашай краіне часцей сустракаюцца змяшаныя формы крыніц.

Толькі ў крыніцах захаваліся водныя жукі *Oreodytes sanmarkii*, *Hydroporus longicornis* і *Hydraena britteni*. Сярод іншых рэдкіх насельнікаў варта адзначыць водных кляшчоў *Arrenurus maculator* і *Hydrobates norvegicus*. Апошні з іх, верагодна, з'яўляецца рэліктам воднай ледавіковай фаўны. Таксама ў крыніцах водзіцца ўнікальны для Беларусі від ракападобных — рачок сінурэла *Synurella ambulans* (рэліктавы від, насельнік як паверхневых, так і падземных водаў). Пастаянна дзеючыя шматводныя крынічныя ручаі з вымытымі доннымі заглыбленнямі — месцы жыхарства ручаёвай стронгі *Salmo trutta morpha fario*. У крынічных вадаёмах і вадацёках праводзіць лічынкавы перыяд мінога рачная *Lampetra fluviatilis*.

Прыклады знішчэння крыніц могуць прыгадаць многія, а вось каб у нейкім месцы раптам заструменіла новая — наўрад ці хто пакажа.

Мяркую, асноўная сістэма крыніц сфарміравалася яшчэ 10 тыс. год таму, калі адсюль адступаў ледавік і ўтвараўся тутэйшы рэльеф і водная сістэма ў цэлым.

Але вы ж ведаеце, што ў нас была меліярацыя, «паляпшэнне воднага рэжыму» Палесся, якое сталася па сутнасці асушэннем. Цалкам верагодна, што на дне асушальных каналаў маглі пракласці сабе новыя выхады тыя ручаінкі, што былі задушаны ў час выпроствання пакручастых рачулак. Думаю, гэта таксама можна трактаваць як з'яўленне новых крыніц.



Вапнавыя туфы ІГАР РУДАКОЎСКІ



Рэакрэн ЮРЫ ГІГІНЯК

2. Крыніцы з вапнавымі туфамі

Вапнавы туф, або траверцін, — асадкавая горная парода, якая складаецца пераважна з карбанату кальцыю. Утвараецца, калі ў поласцях з вады, абагачанай вапнай, асаджваецца раствораны карбанат кальцыю. «Скарыначка» з яго здольна хутка пакрыць невялікую расліну. Гэта з'ява называецца «петрыфікацыя», што значыць «скамяненне». Характэрная рыса расліннасці туфавых крыніц — мноства імхоў. Для Беларусі такія крыніцы ўнікальныя, бо паверхневыя карбанатныя пароды ў нас сустракаюцца зрэдку. Робіць пэўны ўплыў і клімат: у халодны перыяд працэсы петрыфікацыі замаруджваюцца ці нават спыняюцца.

Да гэтага тыпу крыніц належаць, напрыклад, Юцкоўская (Дзяржынскі раён), Святыя крыніцы (Лагойскі раён), выхады падземных водаў па берагах ракі Пціч у Мінскім раёне.

3. Крынічныя азёры на карставых участках

Карстам называюцца працэсы, якія выклікаюць растварэнне горных парод і ўтварэнне ў іх пустэч. Для Беларусі крынічныя азёры на карставых участках — з'ява ўнікальная. Яны сустракаюцца на тэрыторыях, дзе блізка да паверхні залягаюць мергельна-мелавыя пароды, і ўяўляюць з сябе запоўненыя вадой варонкі.

Самы буйны па плошчы і аб'ёме выхад глыбінных падземных карбанатных водаў у выглядзе возера ўтварае Блакітную крыніцу, што ў Слаўгарадскім раёне Магілёўскай вобласці. Яе даўжыня 25 м, максімальная шырыня 15 м, глыбіня 2 м. Вада выходзіць на паверхню з глыбіняў 100–200 м, дзе яна цыркулюе ў тоўшчы мелавых парод. Тут фарміруюцца ўнікальныя для Беларусі калоніі пурпурных бактэрый *Purple bacteria*.

Такія біятопы павінны знаходзіцца пад аховай дзяржавы.
Калі вы знайшлі такую крыніцу, паведаміце пра гэта на info@ptushki.org.


ІГАР РУДАКОЎСКІ

З якіх прычын крыніца можа знікнуць?

Як ні парадаксальна, самая вялікая небяспека — гэта ўпарадкаванне. З аднаго боку, добра, калі крыніца дагледжаная, калі народ вучаць любіць помнікі прыроды, клапаціцца пра іх. Але, з другога боку, часта людзі проста не ведаюць, як можна нашкодзіць.

Усе крыніцы Беларусі — даволі пяшчотныя стварэнні. Вялікіх, моцных крыніц у нас няма, за рэдкімі выключэннямі кшталту Слаўгарадскай.

І самая распаўсюджаная памылка — ставіць якое-небудзь бетоннае кальцо ў месцы выхаду крыніцы на паверхню. Узровень вады ў ім пачынае падымацца, і ціск гэтай вады рана ці позна робіцца большым за напорны ціск самой крыніцы. І тая ўжо не можа выйсці на паверхню і знаходзіць сабе іншы шлях.

Я ведаю прыклады, калі пасля «ўпарадкавання» крыніцы знікалі. У вёсцы Чорная, што пад Рэчыцай, здаўна была вядома прыгожая крыніца. Гэтая тэрыторыя прыпісана да Свята-Георгіеўскай царквы, што месціцца ў вёсцы. Зрабілі маштабны праект, пабудавалі капліцы, купелі, асвяцілі. А вось не напаўняюцца вадой купелі, не бяжыць больш ручаінка ў Дняпро. Дзесьці парушылі гідралагічны рэжым — і крыніца не вытрымала.

Безумоўна, усе хочуць як лепш. Таму тут мы павінны з царквой узаемадзейнічаць і неяк разам вырашаць, хто мае права ўпарадкаваць крыніцу, якога ўзроўню павінен быць праект і г. д. Спадзяюся, мы знойдзем агульную мову.

Ёсць жа і вельмі добрыя прыклады царкоўнага ўпарадкавання. Напрыклад, у Глыбоцкім раёне — некалькі «ўзорна-паказальных» крыніц недалёка адна ад адной, у тым ліку крыніца Святога Яна. Крынічныя выхады не парушаны, там можна холадалюбівую фаўну вывучаць, ніжэй зроблена купель, і забор вады зручны, і струмень досыць інтэнсіўны.

Помнікі прыроды і каштоўныя біятопы

А як пазначаюць крыніцы, што знаходзяцца ў прыродным ландшафце?

У нас ёсць сістэма тэрыторый, якія знаходзяцца пад аховай дзяржавы. Туды ўваходзяць запаведнікі, нацыянальныя паркі, заказнікі і помнікі прыроды. Нядаўна з’явілася катэгорыя «рэдкія і тыповыя біятопы». Часам крыніца можа быць аднесена да «помніка прыроды» альбо «рэдкага біятопу». У абодвух выпадках яе бяруць пад ахову.

Праводзяцца навуковыя даследаванні, выяўляюцца ўнікальныя індыкатарныя групы жывёл, пішацца абгрунтаванне і рэкамендуецца надаць крыніцы пэўны статус.

Помнікі прыроды ў нас бываюць мясцовага і рэспубліканскага значэння. Першую катэгорыю зацвярджаюць мясцовыя Саветы, а другую — Савет Міністраў. Выдаткаў тут ніякіх, за выключэннем шыльды з указаннем характарыстык аб’екта. Ну і напісана, што гэта помнік прыроды, што ён ахоўваецца дзяржавай, што нельга яго псаваць, і тэлефоны зваротнай сувязі.

Ці можа крыніца знікнуць сама, без умяшання чалавека?

Калі крыніца не вельмі буйная, яна паступова засмечваецца. Як правіла, вакол крыніц — травастой, кусты, дрэвы, з якіх увосень ападае лісце. Вялікая маса падгнілай арганікі можа спрацаваць як тое самае бетоннае кальцо і задушыць выхад вады на паверхню. Але дастаткова прачысціць крыніцу — і яна зноў будзе функцыянаваць на радасць навукоўцам і проста аматарам прыроды.

Снова в школу?

В Беларуси растет число «дипломированных» любителей наблюдений за птицами, прошедших специальный курс в школе бердвотчеров АПБ. Какие ощущения дают новые знания? Спросили выпускников.

БЕСЕДОВАЛА ИРИНА ГРУЗДИЛОВИЧ



Эллени Вендрас

Птицы для меня — увлекательное хобби. В школу бердвотчеров я пошла, чтобы выучить русские и белорусские названия птиц и познакомиться с новыми видами. На занятиях про каждый вид рассказывали небольшую историю. Я не очень хорошо знаю русский, поэтому было немного сложно запоминать термины и каждый день минут по 5–10 я повторяла материал. Теперь планирую снимать птиц как можно чаще — это будет хорошей тренировкой. Самая интересная для меня птица — гоголь, единственная утка, которая гнездится на деревьях, селится в дуплах. Мне нравится, что она использует и воду, и лес. У меня нет списка увиденных видов, но когда путешествую, то покупаю книги, чтобы познакомиться с птицами разных стран. А после встречи делаю в книгах пометки.



Оксана Суботко

Увлечение птицами началось на даче, у нас там можно встретить множество самых разных птиц. Чтобы понять, кто же к нам прилетает, мы с семьей купили определитель. Когда начала фотографировать, мне подарили объектив с «зумом». Но снимать птиц только для себя было не очень интересно, и я стала искать людей со схожими интересами. Узнала про бердвотчинг, про школу АПБ. В школе меня особенно впечатлили рассказы о хищных птицах, которых я никогда в дикой природе не видела. Было очень познавательно! Даже изучая птиц самостоятельно, по определителю, некоторые детали можешь упустить. А преподаватель заострит внимание на важных признаках — цвете перьев, форме клюва. Или подскажет, что на водоеме прямо в черте города можно увидеть кого-то кроме вездесущей кряквы. Например, нам во время экскурсии встретились гоголи и хохлатая чернеть. Я очень люблю дятлов, особенно их неповторимый стук-дробь. Сразу думается о хорошем, о том, что кто-то готовит дом. А вообще в планах найти какое-то практическое применение этому хобби.



Павел Харитонов

С АПБ я сотрудничаю довольно давно. И все это время смотрел на увлечение птицами со стороны, немного недопонимая, что в этом может быть интересного. А потом все-таки решил углубить свои знания по орнитологии и записался в школу бердвотчеров. Воробья от вороны и грача от галки я и раньше мог отличить, а вот в разной «мелочи» не разбирался. Казалось бы: бери книжку и читай, информации предостаточно. Но когда про птиц рассказывает знающий человек, это намного интереснее и запоминается гораздо лучше. А в школе у нас и экскурсии были, и курсанты подобрались душевные. Моей любимицей была и остается бородатая неясыть, но сейчас еще очень увлек дубонос, я его внимательно рассмотрел во время одной из экскурсий. Курсы закончились, и теперь я самостоятельно езжу, например, в Лошицкий парк, ищу птиц, определяю виды и радуюсь, когда все получается.



Олеся Белецкая

В школу бердвотчеров я записывалась трижды и только с третьей попытки попала на занятия. Раньше не отличала грача от вороны и считала, что в городе живут только голуби да воробьи, а на курсы пришла просто из любопытства. Но этого стоило ждать полтора года! Я очень довольна учебой: замечательные лекторы Максим и Семен, четкая организация занятий и куча подарков. Но самое главное: я стала замечать птиц и удивилась, что такое разнообразие у меня прямо под носом — в городе, в парке. Нужно только присмотреться. На занятиях нам рассказывали много интересного. Например, что хищные птицы-рыболовы носят пойманную рыбу головой вперед. А «лебединую верность», оказывается, вообще люди придумали. Сейчас планирую почаще куда-нибудь выезжать, чтобы наблюдать за птицами. Очень хочу увидеть варакушку и больших сов! На занятиях нам выдали таблицу с 333 видами птиц, и я стала в ней отмечать увиденных. В «копилке» пока около 40 видов.

Мае птушкі — мае ўспаміны

«Удод мой малы» — так мяне называла маці. А неяк за вёскай прытрымала мяне і шапнула: «Слухай! Чуеш: уп-уп-уп? Гэта ўдод крычыць...» Але пабачыць удода ў дзяцінстве мне не пашчасціла.

І жураВоў бачыў толькі высока над галавой. Дакапалі бульбу, садзіцца сонца, бацька выбірае з гарачага прысаку спечаную бульбу. Бульба гарачая, смачная. Неба глыбокае, сіняе, і сумнае «курлы-курлы» ліецца з усяго неба адразу. Кручу галавой ва ўсе бакі, бацька падказвае. Нярoўны клін пралятае ў промнях сонца, і нечага так добра — ад сонца, печанай бульбы, вялікіх птушак у небе.

Чую «журавы» — бачу бацьку. Чую «ўдод» — бачу маму.

А ластаўка — гэта сястра. Неяк прыбегла: «Дапамажыце!» Ластаўкі на франтоне дома гняздзечка лепяць, а яно не трымаецца, ужо тры раз зрываецца. З братам цягнем драбіны, вялізныя, ледзь здужалі паставіць. Брат мяне падтрымлівае, я прыбіваю драўляны брусочак... Прыляцелі ластаўкі, пачалі зноў ляпіць гняздзечка.

Брат — верабейкі. Іх так многа сялілася ў саламяным падстрэшшы старога хлява суседскай бабулі. Брат ноччу пайшоў з ліхтарыкам. Свяціў, руку засоўваў, мацаў — так хацеў злавіць. Ды дзе там!

Сінічка — малодшая сястра. Яна хварэла, была зіма, я змайстраваў кармушку. Птушкі асмялелі, і адна сінічка заляцела ў сенцы. Білася ў шыбы... Калі я злавіў яе, падалося неверагодным, што птушачка такая маленькая і так страшна-хутка калоціцца яе сэрцайка. Даў патрымаць сінічку сястры. Яна разглядвала птушачку, такую дзівосную, зблізку, вочкі яе ззялі, і яна ўпершыню за некалькі дзён усміхалася.

Кнігаўка — маё дзіцячае каханне. Да бабулі, якая жыла па суседстве з намі, прыходзіла дзяўчынка. Неяк прызналася, што вельмі любіць лотаць. І я пайшоў у дзікі луг, там была старая канава і цвіла лотаць. Кнігаўка лётала нада мной так нізка і крычала так жаласліва: кі-гі! кі-гі! Я клаўся на спіну на пакатым схіле канавы, каб лепш пабачыць гэтую не вядомую мне птушку.

Мой сябар дзяцінства, гарадскі хлопец Сяргей — сарокі. Мы пайшлі ў хмызнякі, адшукалі гняздо, далезлі да яго і забралі двух сарачанят, якія ўжо ўставалі на крыло. Ён падмануў мяне, казаў, што сарачанят прыручым, дома трымаць будзем. А потым расстрэльваў іх з новенькай рагаткі... Я напішу аповесць для падлеткаў з гэтым жорсткім эпізодам, калі Сяргея ўжо не будзе сярод жывых. Ён апынецца ў Чарнобылі падчас аварыі, яго маладым з'есць прамянёвая хвароба.



ВАЛЕР ГАПЕЕЎ,
пісьменнік, журналіст

Назавіце мне птушку нашай Беларусі — і ўва мне абудзяцца ўспаміны і згадкі. А што без іх маё жыццё?

Сойка — маладая настаўніца біялогіі, у якую былі закаханыя палова старшакласнікаў. Яна павяла нас у блізкі бярозавы гай на экскурсію. А за гаем пачынаўся лес — мы трошкі заблукалі. Яна тады так спалохалася... Мой аднакласнік добра ведаў тыя мясціны, пра што і сказаў настаўніцы, і нечакана працягнуў ёй тры пярэстыя, у блакітна-чорныя паскі, пёркі. «Сойка згубіла», — сказала настаўніца. І несла іх ашчадна, быццам далікатныя кветкі.

«Галка» — так называлася адно з маіх першых апавяданняў для падлеткаў, з якіх і пачаўся мой шлях у літаратуру. Галка — дзяўчынка-птушка, чыю някідкую прыгажосць трэба разгледзець.

Чайкі... Азёрныя хвалі. Пціч. Сустрэча з будучай жонкай. Полымя вогнішча ўночы, палатка і зіхоткая раніца.

Галубы... Не любіў некалі гэтых птушак. Пакуль аднойчы не пабачыў, як тупаюць яны азызлымі чырвонымі лапкамі ў ледзяной кашы ля кіёска. Сам прамоклы і азяблы, у той момант адчуў іх беспрытульнасць. І дома піў гарачую каву ў цёплай кухні, разумеючы, як гэта важна — мець дом і ежу.

Авяльга — то маладая жанчына, пісьменніца, якой я параіў пісаць па-беларуску. І яна пачала, і яе пазнавальныя па яркім, жыццярадасным стылі тэксты з ахвотай пачалі прымаць самыя розныя часопісы. Сёння я адчуваю адказнасць за яе пісьменніцкі і чалавечы лёс.

Бусел... Могілкі. Радуніца. Старая бяроза, вышэзная, тоўстая. Нам усім было чамусьці важна, каб штогод на Радуніцу быў чутны звонкі клёкат. Мы дзецьмі прыходзілі на могілкі разам з бацькамі, сёння вядзём сваіх дзяцей на магілы нашых бацькоў. А буслянка жыве над могілкамі.

Назавіце мне птушку нашай Беларусі — і ўва мне абудзяцца ўспаміны і згадкі. А што без іх маё жыццё?

...Вёска амаль вымерла, тры жылыя хаты. Буяе зелень. Раніцай усё вакол спявае — як у сапраўдным лесе. Па зарослай дарозе без страху праходжваецца птушка. Кінуўшы на нас кароткі позірк чорнага вочка, займаецца далей сваёй справай — збірае хрушчоў, што ўпалі з маладога дубовага лісця. Стракатая, прыгожая, з памаранчава-чорным чубком на галаве і доўгай тонкай дзюбай.

Удод!

І амаль фізічна адчуваю, які цёплыя маміны рукі кранаюцца маёй галавы, прыгладжваючы мой віхрасты чарнявы ў дзяцінстве чубок.

— Удод ты мой малы...

Птушкі ў вашым аб’ектыве

Гэтай вясной адбыліся адразу два чэмпіянаты па фотабёрдынгу — у Бярэзінскім біясферным запаведніку і ў Тураве. Хто трапіў у аб’ектыў удзельнікаў?



Вушатая сава
ПАВЕЛ НОВІКАЎ



Рачная крычка
ІНА БЯРНАЦКАЯ



Чорнагаловыя шчыглы
ПАВЕЛ АЛЯКСЕЕЎ



Белая пліска
АНДРЭЙ ПІСКУН, ДАР’Я ГРАШЧАНКАВА



Крумкачы
АНДРЭЙ ГАРШКОЎ



Звычайная стрынатка
СВЯТЛАНА САВІЦКАЯ



Звычайны папаўзень
МАКСІМ БАЗБЕЙ, ВОЛЬГА ШЫЛА




Стрынатка-чаротаўка
НАТАЛЛЯ ПАЗНЯК

НАСТУПНЫ ЧЭМПІЯНАТ ПА ФОТАБЁРДЫНГУ АДБУДЗЕЦЦА 5 КАСТРЫЧНІКА Ў МІНСКУ

Ластаўка ці свіргуль? Назірай і адрознівай!


ЧОРНЫ СВІРГУЛЬ
(Черный стриж)

Гняздуе ў населеных пунктах, палюе паўсюдна.



АЛЬПІЙСКІ СВІРГУЛЬ
(Белобрюхий стриж)

Арэал гнездавання — краіны Міжземнамор'я. У Беларусі зарэгістраваны адзін раз у Мінску.




ЛАСТАЎКА-ЗЯМЛЯНКА
(Береговая ласточка)

Яе біятоп — адкрытыя плоскія тэрыторы паблізу вады, стромкія і высокія берагі вадаёмаў. Аддае перавагу рачным далінам, а таксама кар'ерам па здабычы гліны, пяску.




ГАРАДСКАЯ ЛАСТАЎКА
(Городская ласточка, или воронок)

Селіцца побач з чалавекам – паўсюль, дзе ёсць каменныя будынкі.



ВЯСКОВАЯ ЛАСТАЎКА
(Деревенская ласточка)

Жыве ў шчыльным суседстве з чалавекам, часцей за ўсё ў сельскай мясцовасці. Звычайна гняздуе ўнутры пабудоў, таксама робіць гнёзды ў закінутых будынках, пад мастамі.



У 2018 годзе АПБ выдала новы вызначальнік — «Знаёмства з птушкамі Беларусі»

Больш поўнае апісанне відаў птушак, што сустракаюцца ў Беларусі, глядзіце тут:





Шукай мабільны дадатак Ptushki на Play Маркет



Прайдзі дыстанцыйны курс па асновах птушкавання

